ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 26 (821) ● Чацвер, 30 верасня 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV



## НАЙПЕРШЫ ДАРАДЧЫК

Мінулі першыя тыдні заняткаў, адбылося знаёмства першакурснікаў з універсітэтам, а куратараў—са сваімі выхаванцамі. Цяпер на працягу навучальнага года ім прадстаіць працаваць у цеснай садружнасці, разам рашаць складаныя і простыя пытанні, якія вылучае жыццё групы.

Аб тым, як лепш працаваць, аб задачах куратараў, якія працуюць з першакурснікамі, ішла размова на нарадзе, скліканай парткомам. Перад куратарамі выступіў прарэктар БДУ А. Я. Малышаў. Ён канкрэтызаваў абавязкі куратараў, падкрэсліў, што яны павінны быць сапраўднымі памочнікамі рэктарата, дэканаў ва ўсёй вучэбнай і выхаваўчай рабоце.

Вучыць вучыцца — адна з галоўных задач куратара. Менавіта ён уводзіць першакурсніка ў студэнцкае жыццё, знаёміць з новымі формамі работы, дапамагае размеркаваць час, параіць, як лепш скласці канспект. Ад яго толькі што прыйшоўшыя ва універсітэт юнакі і дзяўчаты даведаюцца аб правілах паводзін ва універсітэце і інтэрнаце.

Сур'ёзна і штодзённа павінна весціся выхаванне высокіх маральных якасцей маладога чалавека, яго здольнасцей і густу да грамадскіх спраў.

Асаблівую ўвагу А. Я. Малышаў звярнуў на задачы, якія трэба вырашыць у юбілейным годзе.

На нарадзе выступіў сакратар парткома М. К. Гарбачоў.

**Я. МАРКАЎ.**

## СВЯТА СЯБРОЎ

У поездзе было весела і шумна, як у любой студэнцкай кампаніі. Кожны быў крыху ўзрушаны: наперадзе—Масква. Там, у дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава, іх з нецярплівасцю чакаюць. У сувязі з 50-годдзем утварэння Саюза ССР МДУ праводзіць дні братніх рэспублік. Вялікі гонар выпаў нам, беларусам,—дэлегацыя БДУ была першай.

Масквічы сустракалі проста і шчыра, па-руску гасцінна. Разумеючы наша вялікае жаданне бліжэй пазнаёміцца з буйнейшай у краіне навучальнай установай, арганізавалі экскурсію па універсітэту на Ленінскіх гарах. Гэты дзівосны храм навукі зачараваў сваёй велічнасцю, прыгажосцю, усяліў у нашы сэрцы яшчэ большую гордасць за росквіт савецкай навукі.

Другі дзень быў вельмі насычаны. З раніцы — рэпетыцыя мастацкай самадзейнасці. А ў сем гадзін вечара...

У зале Дома культуры МДУ сабраліся маскоўскія студэнты, выкладчыкі, работнікі універсітэта. Права пачаць урачысты вечар было прадастаўлена рэктару БДУ, Герою Сацыялістычнай Працы акадэміку А. Н. Сеўчанку. Антон Нічыпаравіч расказаў пра даўнія сувязі паміж нашымі універсітэтамі, падкрэсліў, што яшчэ пры стварэнні першай беларускай вышэйшай навучальнай установы адчувалася моцная падтрымка, клапатлівая ўвага маскоўскіх калег. Масквічы дапамагалі беларусам чым толькі маглі: падзяліліся абсталяваннем, кнігамі, накіравалі вядучых вучоных. І вось цяпер, калі БДУ — буйнейшая вышэйшая навучальная ўстанова Беларусі, калі тут свая, адна з самых вялікіх у краіне, школа фізікаў, калі універсітэт па праву лічыцца заснавальнікам шэрагу вну рэспублікі, калі сувязі універсітэцкіх вучоных з вытворчасцю сталі шырокія і трывалыя,—мы па-ранейшаму памятаем, што многім абавязаны старэйшаму брату—рускаму народу.

Аб нашай рэспубліцы, аб жыцці і дзейнасці шматтысячнага калектыву камсамоліі БДУ расказалі прысутным прафесар С. М. Малінін і сакратар камітэта камсамола В. І. Пракошын. Два дакументальныя фільмы «Боль мой — Хатынь» і «Дзень добры, універсітэт» падарылі прадстаўнікі нашай дэлегацыі масквічам.



Калектывы мастацкай самадзейнасці — народны аркестр народных інструментаў і народны ансамбль танца «Крыжачок» — выступілі з вялікай разнастайнай канцэртнай праграмай. Хочацца асобна адзначыць удзельнікаў гэтых калектываў, іх кіраўнікоў М. А. Лісіцына, М. В. Лапшу, У. С. Краснаярцава, вядучых Марыну Багрый-Шахматаву і Леаніда Нарэйку, якія паказалі на сталічнай сцэне высокае выканаўчае майстэрства, пакарылі масквічоў сціпласцю і элегантнасцю знешняга выгляду. Аб гэтым сведчаць словы масквічкі Аляксандры Іванаўны Кіядкінай: «Шмат новага і цікавага я пачула сёння аб Беларусі, аб вашым універсітэце. Я як звычайны рускі чалавек вельмі рада за поспехі братоў - беларусаў. Большасць сённяшніх гасцей—маладыя прадстаўнікі вашай рэспублікі. Сэрца мае поўніцца гордасцю за наша маладое пакаленне. Сёння пасланцы БДУ запаланілі нас цудоўным выступленнем, а яшчэ больш сваей сціпласцю, высокай культурай і добразычлівасцю. Як прадстаўніца старэйшага пакалення я задаволена, што за такой моладдзю наша будучыня».

А вось што запісалі ў мой блакнот студэнткі эканамічнага факультэта МДУ Наташа Мядзведзева і Святлана Гоманава: «Уражанні самыя лепшыя. Малайцы, малайцы, малайцы! Так скажа кожны, хто пабываў на канцэрце студэнтаў БДУ. Кожны наступны нумар быў лепшы за папярэдні. Не хапае слоў, каб выказаць усё захапленне і найвялікшую задаволенасць, якія мы атрымалі, прагледзеўшы канцэрт. Нам, удзельніцам студыі мастацкага слова Дома культуры МДУ, спадабалася выступленне М. Багрый - Шахматавай. Прыемная вядучая і таленавіты чытальнік. Нас пакарыла амаль прафесійнае майстэрства вашых калектываў. Яшчэ раз ад усёй душы дзякуем вам. Спадзяемся, што гэтая сустрэча не апошняя. Да новых сустрэч!»

У знак шчырай удзячнасці акадэміку А. Н. Сеўчанку уручан прывітальны адрас і памятны медаль Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Камітэт камсамола МДУ узнагародзіў ансамбль танца «Крыжачок» і аркестр народных інструментаў ганаровымі граматамі.

Сустрэча масквічоў і беларусаў яшчэ раз прадэманстравала вялікую дружбу і ўзаемную прыхільнасць двух братніх народаў.

**А. АЛЕКСАНДРОВІЧ,**
**спец. кар.**

**НА ЗДЫМКАХ:** (уверсе) на Краснай плошчы; (унізе) у геолага-мінералагічным музеі МДУ.

*Фота аўтара.*

## АБ УСЕСАЮЗНЫМ ЛЕНІНСКІМ ЗАЛІКУ

**«З мэтай далейшага паляпшэння камуністычнага выхавання камсамольцаў і моладзі, паспяховага рашэння цэнтральнай задачы камсамола, вызначанай партыяй, правесці Усесаюзны Ленінскі залік «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!»**

(З пастановы бюро ЦК ВЛКСМ).

Камсамольская арганізацыя універсітэта многае зрабіла ў ходзе правядзення першага і другога ленінскіх залікаў. Узрасла грамадска-палітычная актыўнасць, многія камсамольцы больш акрэслена вызначылі сваё месца ў жыцці калектыву. Але яшчэ многае трэба зрабіць. Недастатковы ўзровень палітычнай работы ў групах. Некаторыя студэнты слаба разбіраюцца ў палітычных падзеях у нашай краіне і за мяжой. Былі выпадкі фармальнага падыходу да заліку, часам прымаліся неканкрэтныя абавязацельствы.

У гэтым годзе ўсе камсамольцы універсітэта павінны прыняць актыўны ўдзел ва Усесаюзным Ленінскім заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!» Кожны камсамолец абавязан унесці свой асабісты ўклад у работу арганізацыі на гэтым важным этапе.

**Галоўныя задачы Ленінскага заліку:**

**— выхаванне моладзі ў духу камуністычнай ідэйнасці, адданасці Савецкай Радзіме, у духу інтэрнацыяналізму, актыўная прапаганда норм і духоўных каштоўнасцей савецкага грамадства;**

**— уздым агульнаадукацыйнага і палітычнага ўзроўню моладзі, глыбокае і творчае вывучэнне ўсімі камсамольцамі, камсамольскімі работнікамі і актывістамі, юнакамі і дзяўчатамі марксісцка-ленінскай тэорыі, Справаздачнага даклада Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева, дакументаў і рашэнняў XXIV з'езда КПСС;**

**— павышэнне працоўнай актыўнасці моладзі, выхаванне новых камуністычных адносін да працы, актыўны ўдзел ва ўсенародным сацыялістычным спаборніцтве за паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXIV з'езда КПСС, за датэрміновае выкананне планаў дзевятай пяцігодкі;**

**— павышэнне ролі камсамольцаў, моладзі ў паскарэнні кавукова-тэхнічнага прагрэсу, усямерным павышэнні вытворчасці працы, эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, далейшым уздыме сельскай гаспадаркі, выхаванне эканоміі і беражлівасці;**

**— выхаванне маральна-палітычных якасцей сапраўднага савецкага чалавека, паляпшэнне эстэтычнага, маральнага, прававога выхавання моладзі, барацьба з парушальнікамі савецкіх законаў, норм і прынцыпаў камуністычнай маралі, п'янствам і хуліганствам сярод моладзі;**

**— паляпшэнне фізічнага і ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі, падрыхтоўка яе да службы ў радах Савецкай Арміі, павышэнне адказнасці маладых воінаў за бездакорнае выкананне свайго воінскага доўгу;**

**— узмацненне камсамольскай дапамогі школе, асабліва сельскай, дастойная сустрэча 50-годдзя Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна;**

**— арганізацыйна - палітычнае ўмацаванне пярвічных камсамольскіх арганізацый, камсамольскіх груп, павышэнне іх баявітасці, грамадска-палітычнай актыўнасці ўсіх членаў ВЛКСМ, уменне дайсці ў камсамольскай рабоце да кожнага камсамольца, юнака і дзяўчыны, дапамагчы ім знайсці сваё канкрэтнае месца ў барацьбе за выкананне рашэнняў XXIV з'езда КПСС.**

ЦК ВЛКСМ рэкамендуе правесці Ленінскі залік ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях у тры этапы.

**Першы этап — да 29 кастрычніка 1971 года.**

У ходзе гэтага этапа камсамольскім арганізацыям неабходна прааналізаваць удзел кожнага члена ВЛКСМ у выкананні рашэнняў XXIV з'езда КПСС, сацыялістычных абавязацельстваў, пастановы Усесаюзнага камсамольскага сходу (май 1971 г.). Кожнаму камсамольцу да 1 кастрычніка скласці асабісты план «Вучыцца камунізму», які б найбольш поўна характарызаваў імкненне па-ленінску жыць, працаваць і змагацца, паўсядзённа выконваць рашэнні партыі, актыўна займацца грамадскай работай.

Камсамольскай арганізацыі універсітэта трэба распрацаваць і здзейсніць меры, накіраваныя на забеспячэнне выдатнай і добрай вучобы студэнтаў, на прыцягненне іх да актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці, да працы на карысць Радзімы. Дакладна вызначыць задачы ўсіх факультэцкіх арганізацый па аказанню дапамогі школе. Дабіцца, каб у кожным піянерскім атрадзе быў важаты, у кожнай школе — спорттарадок,

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# АБ УСЕСАЮЗНЫМ ЛЕНІНСКІМ ЗАЛІКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

інструктары- добраахвотнікі, кіраўнікі навуковых, тэхнічных і мастацкіх гурткоў. Кожная камсамольская арганізацыя да 19 мая 1972 года павінна падрыхтаваць падарунак піянерскай дружыне, атраду, звяну.

Аказаць практычную дапамогу першакурснікам.

У ходзе падрыхтоўкі і правядзення выбараў у камсамольскіх арганізацыях трэба падвесці вынікі першага этапа Ленінскага заліку, дабіцца, каб кожны камсамолец меў канкрэтнае даручэнне камсамола, каб кожны камсамольскі калектыў быў ініцыятарам і ўмелым арганізатарам канкрэтных камуністычных спраў.

**Другі этап — да 1 лютага 1972 года.**

На гэтым этапе неабходна прыняць канкрэтныя меры, якія забяспечваюць безумоўнае выкананне сацыялістычных абавязацельстваў. Вынікі другога этапа Ленінскага заліку і задачы камсамольскіх арганізацый на 1972 год у студзені месяцы абмеркаваць на камсамольскіх сходах.

**Трэці этап — да 22 красавіка 1972 года.**

Да 102-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна неабходна глыбока і патрабавальна прааналізаваць, што зроблена за год, прайшоўшы пасля XXIV з'езда партыі, як здзяйсняецца цэнтральная задача камсамола.

Ва ўсіх пярвічных камсамольскіх арганізацыях краіны пройдзе грамадска-палітычная атэстацыя камсамольцаў. Рашэнні аб здачы Ленінскага заліку прымаюць камсамольскія сходы, улічваючы ідэйна-тэарэтычную падрыхтоўку, працоўную і грамадска-палітычную актыўнасць, маральны воблік камсамольцаў і моладзі.

### НАПРАМКІ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ЧАС ПРАВЯДЗЕННЯ ЛЕНІНСКАГА ЗАЛІКУ

**Бюро групы:**

1. Камсорг і адказны за ідэалагічную работу ў групе разам са старшынёй курсавой камісіі складаюць план правядзення Ленінскага заліку ў групе.

2. Камсорг, адказныя за ідэалагічную і вучэбную работу ў групе сумесна з камісіяй кантралююць выкананне асабістых і групавых абавязацельстваў, складаюць групавы рапарт па выніках Ленінскага заліку.

3. Асаблівая ўвага павінна быць звернута на наступныя пытанні: вынікі экзаменаў па грамадскіх навуках, удзел студэнтаў у працоўным семестры, палітычны ўзровень камсамольцаў, удзел у конкурсе работ па грамадскіх навуках.

4. Кола пытанняў адказнага за вучэбную работу: стан вучобы і дысцыпліны ў групе, ход залікаў і экзаменаў у сесію, работа з адстаючымі, удзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце.

**Курсавога бюро:**

1. Сакратар бюро адказвае за арганізацыю і правядзенне Ленінскага заліку ва ўсіх групах курса, кантралюе работу камсоргаў па Ленінскаму заліку, здае ў камітэт камсамола факультэта курсавы рапарт.

2. Ідэалагічны сектар арганізуе ў кантакце са старшынёй курсавой камісіі па Ленінскаму заліку ўсю работу курсавой камісіі.

3. Вучэбны сектар кантралюе работу ў групах па Ленінскаму заліку, праводзіць з улікам вынікаў Ленінскага заліку агляд-конкурс на лепшую групу курса, прапагандуе агляд-конкурс у студэнцкіх групах.

4. Усе члены камсамольскага бюро ўдзельнічаюць у рабоце камісіі па Ленінскаму заліку, прысутнічаюць на сходах у групах курса. На пасяджэннях курсавога бюро заслухоўваюцца справаздачы аб ходзе Ленінскага заліку, падводзяцца яго вынікі і зацвярджаецца курсавы рапарт аб Ленінскім заліку.

**Камітэта камсамола факультэта:**

1. Сакратар, намеснікі па ідэалагічнай і арганізацыйнай рабоце праводзяць рэгулярныя нарады сакратароў камсамольскіх бюро курсаў па Ленінскаму заліку.

2. Ідэалагічны, вучэбны, арганізацыйны сектары камітэта камсамола кантралююць правядзенне заліку на курсах.

3. Камітэт камсамола працуе ў цесным кантакце з камісіяй па Ленінскаму заліку, якая ўключае ў сябе камсамольскі актыў, прадстаўнікоў партыйнай арганізацыі і выкладчыцкага саставу.

**У. КУЗЬМІНАЎ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.**

*● ПРАЦОЎНЫ ВЕРАСЕНЬ ●*

# *ВЯСЁЛАЯ ПАРА ТЫ, ВОСЕНЬ...*

Нас тут у вёсцы Ферма-Гай Дзяржынскага раёна 10 юнакоў — студэнтаў II курса факультэта журналістыкі. Невялікая гэта вёсачка знаходзіцца ў двух - трох кіламетрах ад Дзяржынска. Наш мужчынскі батальён вядзе наступленне ва ўсіх напрамках ад вёскі: працуем на бульбяных палетках, фермах, ля скірдаў саломы і г. д. Бывае і нялёгка, але вясёлы жарт, усмешка сябра і ранішні зарад бадзёрасці адганяюць цяжкасці, і рукі нашы не ведаюць стомы. Але пачнем з ранку.

...Над вёскай імжыць восеньскі дожджык. Надакучлівы, ціхі, ён то зусім сціхае, то, нібы з парванага рэшата, паціхеньку сочыцца, а то лье, як з вядра.

З першага дня дамовіліся работу пачынаць у 8 гадзін раніцы. Да брыгаднага двара нешта сёння не спяшаюцца калгаснікі, а наша дзесятка — у зборы. Пяць-шэсць мінут нарады—і кожны ведае сваю задачу. А яшчэ праз некалькі мінут усе на сваім месцы. Адны падвозяць салому, другія ўкрываюць капцы, трэція — на бульбаўборачным камбайне.

— Усе хлопцы без выключэння працуюць на пяць з плюсам, — гаворыць памочнік начальніка вытворчага ўчастка Віктар Жылевіч. Калгаснікі дзівяцца іх працавітасці. У мінулыя гады ў Ферма-Гай таксама прыязджалі студэнты, але працавалі «стук-грук абы з рук». А сёлета выдатна, такія вясёлыя, добрыя хлопцы.

Вечарам, як заўсёды, збіраемся ўсе разам. І дзе толькі дзяецца ў хлопцаў стомленасць, калі Пятро Дзятлікові ці Уладзімір Далькоў бяруць у рукі гармонік. І тады міжволі нараджаецца песня. Некаторыя з хлопцаў ідуць на спатканні. Многія чаруюць над сваімі «творамі»: усё ж мы журналісты. А пісаць тут ёсць аб чым. Наогул, мы тут не сумуем.

**І. СЦЯПУРА,**
**студэнт журфака.**

*● ПРАЦОЎНЫ ВЕРАСЕНЬ ● РАСКАЗВАЮЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ* *● ПРАЦОЎНЫ ВЕРАСЕНЬ ● РАСКАЗВАЮЦЬ УДЗЕЛЬНІКІ*




Месца падзей — вёска з прыемнай назвай Вішнёўка калгаса імя Кірава Дзяржынскага раёна.

Час дзеяння — працоўны верасень 71-га.

У навакольных вёсках пра вішнёўскіх студэнтаў гавораць: «У! Працуюць...» — але чамусьці без зайздрасці.

* * *

Часам здаецца, што доўгія баразны шэрымі стрэламі адыходзяць за гарызонт і няма ні канца ім, ні краю... Працуюць амаль моўчкі. Толькі з гулам сыплецца з вёдзер бульба ў чарговую скрыню, і вось яна, паскрыпваючы, паволі і цяжка паўзе да земляных буртоў на другое поле, дзе чакаюць яе мазолістыя рукі Мішы Дашко і Лёні Нарэйкі.

Вознік А. К. Крывовіч залюбаваўся работай студэнтаў.

— Добра працуюць. Калі б не яны, самі б не справіліся, — гаворыць і паказвае на калгасніц, якія ідуць амаль побач са студэнтамі: — Вось і ўся наша рабочая сіла...

Не зусім удачна складвалася «бульба-71» для студэнтаў другой групы. Па-першае, матрыярхат: з 21 чалавека толькі 6 хлопцаў. Па-другое, непрыемнае надвор'е, па-трэцяе, ніякага энтузіязму. Але дождж не вечны, а энтузіязм ужо прыходзіць у час працы.

Непаразуменні вырашаліся проста на бульбяных палях. Закончыліся яны тым, што ў групе некалькіх чалавек сталі ласкава называць «сачкамі». Дарэчы, гэта ўжо не так важна, галоўнае—закончыліся. І хутка ў перапынках паміж работай у халодныя дні студэнты разам грэліся ля кастроў.

Тым, як наладжана работа, студэнты Вішнёўкі выгадна адрозніваюцца ад некаторых іншых груп у раёне: і норму даюць, і не «выматваюцца». Аднак гэта не гаворыць аб тым, што на іх палях не гарыць агонь спаборніцтва. На шчасце, гарыць, і не толькі на палях.

Як ужо вядома, у групе па статыстыцы на пятнаццаць дзяўчат усяго шэсць рабят. І гэтыя пятнаццаць добра усвядомілі запаведзь, якая вяшчае, што «шлях да сэрца студэнта ляжыць праз яго страўнік». І полымя барацьбы запалыхала на групавой кухні. Вядома, што пасля смачных супаў і каш рабятам не страшныя самыя доўгія баразны. «Цудоўна!» — гавораць яны, а дзяжурныя дзяўчаты Ліда Перасыпкіна, Аня Ламека і Ала Багачова нават бянтэжацца:

— Мы расцём ад вашых пахвал...

Ці стамляюцца студэнты? Вядома. Аднак гэта не перашкаджае ім зрабіць вечар самай цікавай і прыемнай часткай усяго дня. Звычайна пасля работы ідуць за 5 кіламетраў у Касілавічы, дзе сустракаюцца ў кіно і на танцах са сваімі калегамі з суседніх вёсак. Назад вяртаюцца ўжо на змярканні. Спяваюць песні пра дзіўных людзей, аб далёкіх гарадах. Слухаюць новыя песні Леаніда Нарэйкі.

— У яго к вечару нават голас званчэйшым становіцца, — жартуюць дзяўчаты.

* * *

Вішнёўку акружаюць яшчэ некалькі некранутых бульбяных палёў. Працоўная «адысея» працягваецца. З нормамі — поўны парадак. «Сачкі-арыстакраты» адчуваюць сябе адзінока.

**В. ЖУК,**
**наш спец. кар.**





# *ДРУЖНА, СТАРАННА*

У прыгожых мясцінах ля рэчкі Усы раскінуліся палі і сады калгаса «Непераможны сцяг». Сёлета тут пад кіраўніцтвам выкладчыкаў Я. М. Камароўскага і Т. М. Дзевялтоўскай працуюць студэнты другога курса філалагічнага факультэта. З першых дзён хлопцы і дзяўчаты ўключыліся ў дружную работу. Кажуць, што добры пачатак мае шырокія крылы. Студэнты працуюць на бульбакапалках, сартавальных машынах, на земляных работах. З садоў у сховішчы паступаюць скрыні з духмянымі яблыкамі, усё даўжэй і даўжэй становяцца бурты з бульбай. І калгас па ўборцы ўраджаю — на адным з першых месц у раёне.

Радуюцца і рабяты, што натхнёнай працай яны ўносяць сваю долю ў агульную калгасную справу. З удзячнасцю паціскае рукі рабятам брыгадзір чацвёртай брыгады К. Круглік. Як-ніяк, а работы па ўборцы бульбы ўжо закончаны. Апошнія дні працуюць тут студэнты на сартавальнай машыне і закрываюць земляным покрывам высокія бурты.

І з першага па апошнія дні верасня ўсюды адчуваўся працоўны энтузіязм, бадзёры настрой. Не дзіўна, што ў гулкі шум машыны ўплятаецца звонкая, вясёлая песня. Але немагчымы, відаць, агульны энтузіязм без асобных энтузіястаў. Ёсць сярод нас хлопцы і дзяўчаты, якія і ў працы першыя, і з песняй у сяброўстве. Гэта Р. Вараб'ёва, Л. Емельяновіч, Р. Крывенькая, Л. Лаўрыновіч, М. Зуеў, І. Лобан і іншыя.

Раніца... Замёр у лагчынах туман, і ўзнімаецца над дахамі хат малінавае сонца. Прачынаецца вёска Забалоцце. Пачынаецца новы працоўны дзень. І хутка грузавік зноў паімчыць гарэзлівых хлопцаў і дзяўчат на знаёмае поле.

**В. КАСТРУЧЫН,**
**В. ЗАРУБА,**
**студэнты II курса філалагічнага факультэта.**





НА ЗДЫМКАХ: лекцыю па вышэйшай матэматыцы для студэнтаў I курса аддзялення паліт-эканоміі чытае ст. выкладчык А. Я. МАКСІМЕНКА. Фота *Д. Чаховіча.*

# АНКЕТА ПЕРШАКУРСНІКА

**1. Адкуль прыехалі, чаму выбралі іменна гэты факультэт?**
**2. Уражанні аб занятках (лекцыях, практычных). Дзе звычайна рыхтуецеся, у якіх умовах, ці падабаюцца бібліятэка, чытальныя залы, як абслугоўваюць у бібліятэцы, ці цяжка канспектаваць работы класікаў марксізму-ленінізму? Ці часта выступаеце на семінарскіх?**
**3. Каго і чаму выдзяляеце сярод выкладчыкаў?**
**4. Ці прымаеце ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта? Якія наведваеце гурткі, спартыўныя секцыі?**
**5. Дзе харчуецеся? Ці заўсёды паспяваеце паесці?**
**6. Дзе жывяце і як?**
**7. Як выкарыстоўваеце вольны час (калі ён ёсць) і рабочы, ці ўсё задуманае паспяваеце зрабіць?**

Віктар **ДУДКО:** (ФПМ, 6 група):

— Сам мінчанін. Служыў у Савецкай Арміі. 15 снежня мінулага года паступіў на падрыхтоўчае аддзяленне. У ліпені паспяхова здаў выпускныя (яны адначасова ўступныя) экзамены. Залічан па факультэт прыкладной матэматыкі. Пайшоў вучыцца іменна матэматыцы, таму што ў мяне гэта лепш атрымліваецца. Падабаецца, адным словам.

За месяц вучобы дала адчуць нагрузка. Даводзіцца многа працаваць. Лекцыі даволі аб'ёмістыя. Не усе ёсць падручнікі ў мяне, і таму вельмі часта рыхтуюся да заняткаў у бібліятэцы. Бібліятэка вельмі добрая, толькі часта вялікая чарга за падручнікамі, і даводзіцца траціць многа часу.

Работы класікаў марксізму-ленінізму канспектую з ахвотай, таму цяжкасці асаблівай не адчуваю.

Хачу адзначыць выкладчыка Ераксіна, які праводзіць семінары па гісторыі КПСС. Плённа праходзяць 2 гадзіны. У гутарцы. Выступаў я два разы. Вельмі добра чытае лекцыі У. Т. Воднеў. Учора на матэматычнай логіцы сказалі, што будзе экзамен па гэтай дысцыпліне. Многія не ўсё разумеюць. Самім часам бывае цяжка разабрацца. Нядрэнна было б уключыць у праграму штонебудзь тыпу практычных. А то і на падручніках па гэтаму прадмету ляжыць знак «дэфіцыт».

Я сакратар камсамольскай арганізацыі групы. Пакуль былі два камсамольскія сходы. У план работы арганізацыі ўключана многа цікавага. Калектыў добры, так што сумна не будзе.

Займаюся ў секцыі вольнай барацьбы.

У асноўным харчуюся дома, але часта даводзіцца абедаць у студэнцкай сталовай. Аб стравах нічога адмоўнага сказаць не магу. Нармальна.

Вольнага часу малавата. Прыкладна гадзін 10 у тыдзень. У асноўным гэта — кіно і сустрэчы са знаёмымі рабятамі. Працоўны час — гэта падрыхтоўка да заняткаў. Не заўсёды ўсё паспяваю зрабіць. Напрыклад, пасля ўчарашніх лекцый здавалі нормы па плаванні да 18 гадзін, а сёння да трох лекцый трэба быць падрыхтаваным. Часцей, канешне, падрыхтавацца паспяваю.

Людміла **ЕЎЗРЭЗАВА** (фізфак, 10 група);

1. Закончыла Жлобінскую сярэднюю школу. Чаму паступіла іменна на фізічны факультэт? Напэўна, таму, што я даўно цікавілася фізікай, займалася ў фізічным гуртку, удзельнічала ў алімпіядах, а калі карацей — то проста таму, што фізіка ўвогуле вельмі цікавая навука.

2. Да лекцый я звычайна рыхтуюся ў чытальнай зале, а часам, асабліва вечарам, у сябе ў пакоі. У бібліятэцы бываю рэдка: аддаю перавагу чытальнай зале, таму што там можна хутчэй атрымаць патрэбную кнігу. Аб тым, якое ўражанне выклікаюць семінарскія заняткі і ці цяжка канспектаваць работы класікаў марксізму-ленінізму, цяпер сказаць штонебудзь вельмі цяжка, таму што ў нас былі толькі аднойчы семінарскія заняткі.

3. Яшчэ не разабралася ў сваіх уражаннях.

4. Займаюся ў секцыі спартыўнай гімнастыкі.

5. Звычайна ў сталовай. Паспяваю амаль заўсёды.

6. Жыву ў інтэрнаце.

7. Вольны час у мяне бывае толькі па суботах і нядзелях. У гэтыя дні я еду дадому. У іншыя дні вольнага часу вельмі мала. Ці ўсё задуманае паспяваю зрабіць? Звычайна паспяваю; але часам здараецца, што і не.

**Надзежда ЯНКОВА** (аддзяленне радыёфізікі):

— Я закончыла ШРМ № 4 г. Мінска. Паступіла на аддзяленне радыёфізікі таму, што ў школе больш за ўсё ўвагі ўдзялялася такім навукам, як фізіка і матэматыка. А яшчэ ў нас быў цікавы выкладчык. Ён многа нам расказваў аб гэтай навуцы, расказваў аб яе значэнні ў цяперашні час. Увогуле папраўдпаму фізіку я палюбіла іменна ў гэтай школе, за апошнія тры гады. Яна давалася мне лягчэй за іншыя прадметы. У алімпіядах я часта займала першае месца, таму што хутчэй за іншых рашала задачы.

Лекцыі ў нас чытаюць цудоўныя выкладчыкі. Асабліва мне падабаецца, як чытаюць фізіку і матэматычны аналіз. Праўда, па матэматычнаму аналізу цяпер даволі складаны матэрыял. Таму я займаюся са сваімі рабятамі - аднакурснікамі. Разам нам лягчэй разабраць лекцыі, рашыць задачы па практычных. Займаемся мы часта вечарамі ў інтэрнаце. Рабят з нашага аддзялення тут многа жыве, таму калі мы збіраемся разам, то не перашкаджаем нікому. Хадзіла займацца ў чыталку. Мне падабаецца там.

Цяжка даводзіцца разбіраць і рабіць лабараторныя, таму што лекцый нам яшчэ не начыталі, і сустракаешся з зусім незнаёмымі паняццямі, формуламі.

Абедаю ў нашай студэнцкай сталовай, снедаю і вячэраю ў інтэрнаце. У нас «камуна». Якасцю прыгатаваных страў у сталовай, на жаль, не заўсёды задаволена. Хацелася б, каб у буфетах інтэрнатаў №№ 2, 3 былі часцей першыя стравы.

Вольнага часу ў мяне няма зусім, стараюся больш рацыянальна выкарыстаць час працоўны. Але паколькі вопыту студэнцкага жыцця яшчэ зусім няма, то часам не паспяваю зрабіць усё намечанае. Даводзіцца выкарыстоўваць для гэтага суботу і нядзелю.

# ПАЗНАЁМІЛІСЯ — ПАСЯБРАВАЛІ

Гасцям рады. Асабліва тым, у якіх добрыя пачуцці, шчырыя намеры.

Сяброўская атмасфера, узаемаразуменне панавалі ў час сустрэчы студэнтаў аднаго са старэйшых універсітэтаў Парыжа — Сарбоны — і моладзі, выкладчыкаў, камсамольскіх работнікаў БДУ.

Мэта паездкі юнакоў і дзяўчат Францыі — знаёмства з гарадамі СССР: Масквой, Ленінградам, Мінскам, Тбілісі і правядзенне сяброўскіх сустрэч з баскетбольнымі студэнцкімі камандамі.

Камітэт спортклуба нашага універсітэта на чале са старшынёй С. Камінскім паклапаціўся аб цёплым прыёме гасцей. Ім паднеслі падарунак — статуэтку дзяўчыны ў нацыянальным касцюме, уручылі памятныя значкі і сувеніры. Вітаючы гасцей, С. Камінскі пажадаў ім паспяховага выступлення на баскетбольных пляцоўках. Старшы выкладчык па цяжкай атлетыцы В. Ф. Кавалёў расказаў студэнтам парыжскага універсітэта аб спартыўна-масавай рабоце ў БДУ, аб цудоўных савецкіх спартсменах, выхаванцах універсітэта, якія дабіліся значных поспехаў у спорце.

Затым нашы госці былі прыняты прарэктарам БДУ С. А. Умрэйкам, гутарылі з загадчыкам кафедры французскай мовы М. М. Полазавым, з цікавасцю наведалі спартыўныя залы, агледзелі аўдыторыі, пабывалі на кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, у лабараторыях хімічнага факультэта, сустракаліся са студэнтамі БДУ.

Глыбокія ўражанні засталіся ў французскіх студэнтаў пасля паездкі ў Хатынь і на Курган Славы. Дваццацігадовы Андрэ Бурэль так выказаў свае пачуцці:

— Ваш народ ніколі не забудзе мінулую вайну, сваіх герояў. Такое забыць нельга. І гэта не павінна паўтарыцца.

Сяброўскія сустрэчы закончыліся матчамі. Ігры праходзілі ў спортзале РТІ. А перад гэтым, даведаўшыся, што ў французскай дзяўчыны дзень нараджэння, нашы дзяўчаты падарылі ёй у памяць аб Беларусі маленькі сувенір.

Ігра была вельмі напружанай. Нашы дзяўчаты выйгралі абедзве сустрэчы. Першую з лікам 54:51, другую — 44:33. Але французжанкі не засумавалі ад свайго паражэння. Яны сказалі: «Галоўнае, што мы пазнаёміліся з беларускім народам, з яго багатай нацыянальнай культурай, з яго мінулым, цяперашнім і будучым».

**М. КАЛЯНКОВІЧ.**

*ПАРАДЫ ВЫКЛАДЧЫКА*

# ПРАКТЫКАВАННІ — ШТОДНЯ

**У наш век вялікага тэхнічнага прагрэсу, бурнага развіцця навукі і шырокіх міжнародных сувязей веданне замежных моў набывае асабліва важнае значэнне.**

**У першую чаргу веданне замежных моў неабходна спецыялістам, якія будуць працаваць у навукова-даследчых інстытутах, лабараторыях, вну, на заводах, для паспяховай практычнай дзейнасці. Яно дапаможа аператыўна знаёміцца з узроўнем развіцця навукі і тэхнікі за мяжой, крытычна і творча выкарыстоўваць усе прагрэсіўныя дасягненні сусветнай навукі ў сваёй працы.**

**У сувязі з гэтым я хачу звярнуць вашу ўвагу на сур'ёзнае вывучэнне замежных моў ва універсітэце. Асноўная мэта навучання замежнай мове ў вну — навучыць студэнтаў чытаць арыгінальную літаратуру па спецыяльнасці, а таксама весці гутарку і рабіць паведамленні па вывучанаму матэрыялу. Вось чаму ўжо на першым курсе вы пачынаеце вывучэнне літаратуры па спецыяльнасці, сутыкаецеся з новай лексікай, авалоданне якой патрабуе ад вас вялікіх намаганняў, і з новымі формамі работы, якія адрозніваюцца ад тых, да якіх вы прывыклі ў школе.**

**У вну асновай авалодання мовай з'яўляецца самастойная работа, прычым штодзённая і сістэматычная. Лепш займацца кожны дзень па паўгадзіны, чым два разы ў тыдзень (як правіла, перад заняткамі) па дзве гадзіны. Вы павінны пастаянна памятаць, што навучыць мове нельга, мове можна толькі НАВУЧЫЦЦА, таму роля выкладчыка ў вну зводзіцца толькі да таго, каб зрабіць вашу самастойную работу мэтанакіраванай, аблегчыць ваш шлях авалодання матэрыялам, кантраляваць яго засваенне.**

**Увогуле перш за ўсё самастойная работа над тэкстам, словам, граматыкай. Каб паспяхова справіцца з новым тэкстам, трэба навучыцца аналізаваць сказы, г. зн. знаходзіць у першую чаргу галоўныя члены сказа, пачатак даданага сказа, засвоіць асноўныя словаўтваральныя суфіксы і прэфіксы і г. д. і, вядома, умець карыстацца слоўнікам, што дасць вам магчымасць знаходзіць новыя словы, затрачваючы на гэта мінімум часу.**

**Асабліва старанна трэба працаваць тым, хто прыйшоў ва універсітэт са слабымі ведамі школьнай праграмы.**

**Вопыт паказвае, што пры сур'ёзных адносінах да вывучэння замежнай мовы студэнты к канцу навучання свабодна чытаюць і разумеюць літаратуру па спецыяльнасці, амаль не звяртаючыся да слоўніка.**

**Т. КАВАНАВА,**
**загадчык кафедры англійскай мовы.**

# ШЧЫРЫЯ ПАДЗЯКІ

**Нядаўна ў нашым універсітэце праходзілі практыку студэнты з Вышэйшай педагагічнай школы г. Кракава. Ад'язджаючы на радзіму, у пісьмах на імя рэктара яны пісалі: «Нам хочацца выказаць сваю падзяку выкладчыкам філалагічнага факультэта С. М. Прохаравай і М. І. Сыраквашу, якія суправаджалі нашу групу польскіх студэнтаў з Вышэйшай педагагічнай школы ў Кракаве ў час яе знаходжання на практыцы ў вашым універсітэце. Яны клапатліва адносіліся да нас, імкнуліся, каб мы пабачылі і даведаліся як мага больш. І дзякуючы ім у нас засталіся аб Мінску і вашым універсітэце самыя добрыя ўражанні. Вялікае ім дзякуй!..»**

**«Маем гонар выказаць сваю ўдзячнасць і шафёру М. М. Дудзічу, які быў нашым вадзіцелем на ўсіх экскурсіях. Ён цудоўны майстар. Прытым добра ведае сваю зямлю і таму часта выступае ў ролі гіда, раскрываючы незабыўную прыгажосць вашай беларускай зямлі. Вялікае дзякуй гэтаму працавітаму, цудоўнаму таварышу!».**

# ПРАВЕРКА БОЕМ

Не паспелі яшчэ першакурснікі як след абжыцца ва універсітэце, як пачалася праверка іх спартыўнага майстэрства.

Юнакі і дзяўчаты прынялі ўдзел у спартакіядзе па трох відах спорту: баскетболу, валейболу і футболу. Сярод баскетбалістаў першае месца занялі юнакі юрыдычнага факультэта, у дзяўчат — хімікі. Вызначыліся таксама валейбалісткі юрфака (I месца). На першым месцы аказаліся і рабіты-фізікі. Футбол прынёс поспех біёлагам. Іх каманда паказала сябе самай моцнай і рэзультатыўнай. Яна заняла I месца, перамогшы журфак з лікам 1 : 0.

Каманды-пераможцы спартакіяды ўзнагароджаны граматамі спартыўнага клуба.

С. КАМІНСКІ,
старшыня спартыўнага клуба БДУ.

# МАРШРУТАМІ ДРУЖБЫ

Сёлетні маршрут усесаюзнага турысцкага аўтапоезда «Дружба» пралёг праз Мінск — Оршу — Горкі — Магілёў — Гомель — Рэчыцу — Светлагорск — Любань — Салігорск — Баранавічы — Брэст — Мінск.

За два тыдні каля 150 юнакоў і дзяўчат з 25 краін свету, якія вучацца ў 15 вну Масквы, Ленінграда, Кіева, Мінска, Адэсы і іншых гарадоў Савецкай краіны, праехалі звыш 2 тысяч кіламетраў па беларускай зямлі. Яны пабывалі ў старажытных і зусім яшчэ юных беларускіх гарадах, з цікавасцю знаёміліся з дасягненнямі Савецкай Беларусі ў галіне эканомікі, навукі, культуры, з яе гістарычным мінулым, рэвалюцыйнымі, баявымі і працоўнымі традыцыямі нашага народа, з яе маляўнічай прыродай.

Вялікае ўражанне на гасцей зрабіла беларуская сталіца. У Оршы ўвагу студэнтаў-турыстаў прыкавалі да сябе месцы партызанскай славы заслонаўцаў, а таксама манумент «Кацюша». У Горках дзяцей розных народаў вітаў рэктар старэйшай сельскагаспадарчай вышэйшай навучальнай установы ў краіне — ардэнаноснай БСХА — акадэмік К. М. Сонцаў.

Госці наведалі мемарыяльны комплекс і Музей савецка-польскай дружбы ў пасёлку Леніна. Тут восенню 1943 года разам з часцямі Савецкай Арміі прыняла першы бой польская дывізія імя Тадэуша Касцюшкі, паклаўшая пачатак Войску Польскаму. На мітынгу, які адбыўся тут, выступіў польскі студэнт Маскоўскага інстытута народнай гаспадаркі Ежы Лабош.

Хвалюючымі былі сустрэчы з хлебаробамі. У калгасе імя С. М. Кірава Шклоўскага раёна старшыня калгаса Герой Сацыялістычнай Працы В. Г. Пархоменка, звеннявая Герой Сацыялістычнай Працы К. С. Макарава, сакратар камітэта камсамола настаўніца школы М. В. Цымбалава расказалі гасцям аб барацьбе хлебаробаў за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, паказалі новы пасёлак гарадскога тыпу, які пабудавалі калгаснікі да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі.



Назаўсёды запомняцца падарожнікам і цудоўны Гомель, і Рэчыца, і Светлагорск. Студэнты праехалі па дарогах беларускага Палесся, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны мужна змагаліся з гітлераўцамі інтэрнацыянальныя партызанскія атрады.

У Любанскім раёне Мінскай вобласці ўдзельнікаў аўтапоезда цёпла сустракалі хлебаробы калгаса «Чырвоная змена» і саўгаса «Любанскі».

Усё было цікава ў Брэсце: і дакументальны фільм аб крэпасці-герої, і музей гісторыі абароны цытадэлі, і мемарыяльны комплекс. Ля вечнага агню ўдзельнікі аўтапоезда ўсклалі вянок.

2.000 кіламетраў — гэты маршрут стаў сапраўды маршрутам дружбы.

У. ГАЛАЙША.
Фота А. Ласмінскага.



# ПЛЁН ТВОРЧАЙ ПРАЦЫ

Да пачатку навучальнага года выдавецтвам БДУ выдадзен рад дапаможнікаў, манаграфій, зборнікаў артыкулаў, якія, безумоўна, зацікавяць і студэнтаў, і выкладчыкаў.

Пад рэдакцыяй У. М. Сікорскага выйшла другая частка «Курса лекций по истории КПСС». Падручнік напісан у адпаведнасці з праграмай і вузаўскім вучэбным планам, з'яўляецца неабходным дапаможнікам пры вывучэнні гісторыі нашай партыі.

Для выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў-хімікаў незаменным дапаможнікам з'явіцца кніга В. П. Мардыкіна «Синтез полимеров», у якой у сціслай і па магчымасці даступнай форме сістэматызаван і абагульнен багаты матэрыял па ўказанай тэме.

Студэнтам, асабліва завочнікам, вывучаючым курс «Лінейная алгебра і лінейнае праграміраванне» дапаможа пры авалоданні методыкай рашэння задач кніга М. І. Холада «Пособие к решению задач по линейной алгебре и линейному программированию».

Э. А. Калінінай і У. П. Сярэбранікавым напісана кніга «Крушение колониальной системы империализма и образование независимых государств», якая зацікавіць і гісторыкаў, і эканамістаў, і юрыстаў — усіх, хто праяўляе цікавасць да гісторыі дзяржаў і права краін Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

Пад рэдакцыяй Л. І. Фіглоўскай выдадзен зборнік артыкулаў «В. И. Ленин и художественная литература». Аўтары разгледзелі шэраг пытанняў, якія датычаць асноватворнага значэння геніяльнага ленінскага вучэння, ролі літаратуры ў развіцці мастацтва сацыялістычнага рэалізму, а таксама ўвасабленню вобраза У. І. Леніна ў шматнацыянальнай савецкай і ў зарубежнай літаратуры.

Журналістам — як студэнтам факультэта журналістыкі, так і работнікам друку — будзе цікавай кніга Б. В. Стральцова «Газета и мораль», у якой на канкрэтных прыкладах разглядаюцца прыёмы і метады прапаганды кодэкса камуністычнай маралі на старонках друку нашых дзён.

Добрым навучальным дапаможнікам для студэнтаў-радыёфізікаў па курсу «Излучающие устройства» з'явіцца кніга «Методы расчета и измерения характеристик и параметров антенн» (А. М. Казарын і др.), якая можа быць карыснай разработчыкам апаратуры для вымярэння параметраў антэн.

Найважнейшаму сродку чалавечых зносін — мове — прысвечана кніга А. Я. Супруна «Лекции по языкознанию». Яна дае магчымасць студэнтам не толькі набыць суму пэўных ведаў, але і вучыць самастойнаму мысленню, уменню разбірацца ў запасе прыдбаных ведаў.

На аснове багатага фактычнага матэрыялу напісана манаграфія С. У. Карабана «Нарысы па гісторыі беларускай савецкай крытыкі 20—30-х гадоў». Гэта кніга разлічана на выкладчыкаў вну, аспірантаў, настаўнікаў, студэнтаў. Некаторыя даныя ў ёй упершыню ўводзяцца ў навуковы ўжытак.

«Географию в цифрах и сравнениях» В. А. Жучкевіча, напэўна, з вялікім задавальненнем прачытаюць усе — і фізікі, і філолагі, і матэматыкі, і журналісты, і, безумоўна, географы. Кніга напісана з густам, змяшчае шмат цікавых лічбаў і фактаў.

Кнігі, выдадзеныя выдавецтвам БДУ, можна набыць у кніжным кіёску галоўнага корпуса універсітэта, а таксама ва ўсіх кнігарнях горада.

Л. КАРОБКІНА,
В. СЕРБАНТОВІЧ,
супрацоўніцы выдавецтва БДУ.

# ВЕСНІК УНІВЕРСІТЭТА

У студзені 1969 года чытачы ўпершыню пазнаёміліся з новым навукова-тэарэтычным часопісам «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна». Выходзіць ён у чатырох серыях, на кожную з якіх можна падпісацца асобна.

Першая серыя ўключае як арыгінальныя, так і аглядныя артыкулы па пытаннях матэматыкі, фізікі і механікі.

Для біёлагаў, хімікаў, геолагаў і географаў, безумоўна, уяўляе вялікую цікавасць серыя, якая асвятляе распрацоўкі тэм гэтых напрамкаў навукі і практыкі.

Для тых, хто цікавіцца актуальнымі праблемамі грамадскіх навук, прызначаецца трэцяя серыя. У ёй пяць асноўных раздзелаў: гісторыя, філасофія, навуковы камунізм, эканоміка, правы.

Чацвёртая серыя — адзінае ў Беларусі перыядычнае выданне па пытаннях літаратуразнаўства, мовазнаўства, журналістыкі, педагогікі і псіхалогіі. Рэдкалегія сістэматычна знаёміць чытачоў з важнейшымі навуковымі дасягненнямі беларускіх літаратуразнаўцаў, крытыкаў, лінгвістаў, журналістаў і псіхолагаў.

Кожная серыя выходзіць тры разы ў год. Цана нумара — 80 капеек.

Як набыць часопіс старэйшай вну рэспублікі? Па падпісцы. Яна прымаецца без абмежаванняў усімі аддзяленнямі сувязі і грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.

Часопіс у рознічны продаж не пастурае.

## ● АБ'ЯВЫ ● АБ'ЯВЫ ● АБ'ЯВЫ ● АБ'ЯВЫ

Факультэт грамадскіх прафесій працягвае набор студэнтаў на 1971-72 навучальны год на наступныя аддзяленні:

ХАРЭАГРАФІЧНАЕ
РЭЖЫСЁРСКАЕ
ХОРМАЙСТАРСКАЕ
ЛЕКТАРАЎ
ПІЯНЕРСКІХ ВАЖАТЫХ
СУДДЗЯЎ І ГРАМАДСКІХ ІНСТРУКТАРАЎ ПА СПОРЦЕ.

Тэрмін навучання на рэжысёрскім і харэаграфічным аддзяленнях — тры гады, хормайстарскім — два гады, на астатніх — адзін год.

Харэаграфічнае аддзяленне рыхтуе кіраўнікоў самадзейных танцавальных калектываў, хормайстарскае — кіраўнікоў самадзейных харавых калектываў, рэжысёрскае — рэжысёраў самадзейных тэатральных калектываў.

Той, хто заканчвае факультэт, атрымлівае пасведчанне і права на работу па спецыяльнасці, набытай на адпаведным аддзяленні.

Пачатак заняткаў 15 кастрычніка. Заявы аб прыёме падаваць у камітэт камсамола (207 пакой).

САВЕТ ФАКУЛЬТЭТА ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ.

## ● АБ'ЯВЫ ● АБ'ЯВЫ ● АБ'ЯВЫ ● АБ'ЯВЫ ● АБ'ЯВЫ ● АБ'ЯВЫ ● АБ'ЯВЫ ●

*У мясцкоме універсітэта ёсць пуцёўкі на IV квартал 1971 года:*

*САНАТОРНЫЯ:*

*«КАМУНІСТ» (Есентукі) — з 7 кастрычніка па 1 лістапада;*

*«КРЫНІЦА» — з 3 па 23 лістапада;*

*«ДЗІМТЭНЕ» (Кемеры) — з 12 лістапада па 7 снежня;*

*«ЛЕТЦЫ» — з 16 кастрычніка па 10 лістапада;*

*«НАРАЧ» — з 12 кастрычніка па 6 лістапада;*

*«ХОСТА» (амбулаторнае лячэнне) — з 11 кастрычніка па 5 лістапада і з 22 снежня па 16 студзеня;*

*«БЕЛАРУСЬ» (Рыжскае ўзмор'е) — з 17 снежня па 9 студзеня;*

*«РАССВЕТ» (курорт Моршын) — з 8 кастрычніка па 2 лістапада;*

*«ЦАІШЫ» (Каўказ) — з 26 снежня па 20 студзеня;*

*«ТЭВІНЕ» (Друскінінкай) — з 29 кастрычніка па 23 лістапада;*

*«ІМЯ ЛЕНІНА» (курорт Анапа)—з 4 снежня па 29 снежня (для дарослага і дзіцяці).*

*У ДАМЫ АДПАЧЫНКУ:*

*«ПЕТРАДВАРЭЦ» — з 11 па 22 лістапада і з 23 лістапада па 4 снежня;*

*«СОЖ» — з 30 кастрычніка па 10 лістапада і з 11 па 22 лістапада;*

*«ПУХАВІЧЫ» — з 7 па 18 кастрычніка, з 19 па 30 кастрычніка, з 12 па 23 лістапада і з 24 лістапада па 5 снежня;*

*«НАРАЧ» — з 5 па 16 кастрычніка, з 17 па 28 кастрычніка, з 29 кастрычніка па 9 лістапада (2 пуцёўкі), з 11 па 22 лістапада (2 пуцёўкі), з 5 па 16 снежня (2 пуцёўкі), з 23 лістапада па 4 снежня (2 пуцёўкі), з 16 па 27 снежня (2 пуцёўкі).*

*ПАНСІЯНАТЫ:*

*«ЦЫРУЛІШЫ» — з 25 лістапада па 9 снежня;*

*«КАБАРДЗІНКА» — з 5 па 16 лістапада, з 17 па 28 лістапада;*

*«СВІЦЯЗЬ» — з 9 па 20 кастрычніка і з 21 кастрычніка па 1 лістапада.*

Зак. 1133. АТ 15154 Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Т. 2000 экз. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.